Учреждение образования
«Белорусский государственный университет культуры и искусств»

Факультет традиционной белорусской культуры

Кафедра этнологии и фольклора

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры

_________В.В.Калацэй
01 верасня 2017 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта

__________Н.У.Карчэўская
27 красавіка 2017 г.

ВУЧЭБНО-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПО УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЕ

# СЛУЦКІ ПОЯС: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

*для напрамку спецыяльнасці*
*1-15 02 01 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (па напрамках);*
*1-18 01 01-04 Народная творчасць (фальклор);*
*1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках);*
*1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках);*
*1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)*

Складальнік: Лабачэўская Вольга Аляксандроўна, доктар мастацтвазнаўства, дацэнт, прафесар кафедры этналогії і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта ___ ________________ 20___ г.
пратакол № ___

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СКЛАДАЛЬНІК:**
*В.А. Лабачэўская,* доктар мастацтвазнаўства, дацэнт, прафесар кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЕЦЕНЗЕНТЫ:**
*Т.И. Кухаронак,* старший научный сотрудник отдела народоведения Государственного научного учреждения «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси», кандидат исторических наук, доцент;
*кафедра теории и методики преподавания искусства* Белорусского государственного педагогического университета имени Максима Танка

**РАЗГЛЕДЖАНЫ І РЭКАМЕНДАВАНЫ ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 20 красавіка 2017 г. № 9);
*саветам факультэта* традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 27 красавіка 2017 г. № 9);
*саветам установы адукацыі* «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 23 мая 2017 г. № 9 )

Адказны за рэдакцыю: А.У.Рагуля
Адказны за выпуск: В.А. Лабачэўскя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ


| | | |
|---|---|---|
| 1. | ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ……………………………………........ | 4 |
| 2. | ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ …………………………………………….. | 6 |
| 2.1 | Навучальны дапаможнік па дысцыпліне «Слуцкі пояс: гісторыя і сучаснасць»……………………………………………………………….. | 6 |
| 2.2 | Канспекты (тэксты лекцый) .......................…................................... | 7 |
| 3. | ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ………………………………………………… | 36 |
| 3.1 | Вучэбныя выданні, афіцыныйна рэкамендаваныя МА РБ..... ……….. | 36 |
| 4. | РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ……………………………………..... | 37 |
| 4.1 | Пералік пытанняў да семінарскіх і практычных заняткаў …………… | 37 |
| 4.2 | Заданні для кантралюемай самастойнай работы і графік яе кантролю | 42 |
| 4.3 | Пералік пытанняў да заліку ……………………………………………… | 47 |
| 4.4 | Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў...................... | 49 |
| 5. | ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ ……………………………........................... | 51 |
| 5.1 | Вучэбная праграма УВА па вучэбнай дысцыпліне …………………... | 51 |
| 5.2 | Рабочы тэматычны план па дысцыпліне …………………………….. | 52 |
| 5.3 | Методыкі выкладання дысцыпліны …………………….…………….. | 53 |
| 5.4 | Метадычныя рэкамендацыі | 57 |
| 5.5 | Пералік выданняў і інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў для вывучэння дысцыпліны | 58 |


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Слуцкі пояс: гісторыя і сучаснасць» грунтуецца на палажэннях Дзяржаўнай праграмы адраджэння тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі «Слуцкія паясы» на 2012–2015 гады (пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22.11.2012 № 1069).

Вучэбная дысцыпліна пабудавана па прынцыпе комплекснага паказу асноўных фактаў і падзей з гісторыі стварэння і вытворчасці ўнікальных твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі – слуцкіх паясоў, іх бытавання ў складзе арыстакратычнага мужчынскага касцюма, як прадмета калекцыяніравання, сімвала нацыянальнай культуры. Прынцып гістарычнага агляду, які пакладзены ў аснову дысцыпліны, злучаецца з мастацтвазнаўчым і культуралагічным аналізам мастацка-стылістычных і тэхніка-тэхналагічных асаблівасцей слуцкіх паясоў, знакавага і сімвалічнага характару гэтай з'явы нацыянальнай культуры. У працэсе вывучэння дысцыпліны разглядаюцца пытанні выкарыстання і стылізацыі дэкаратыўных матываў слуцкіх паясоў у беларускім выяўленчым, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве і сцэнаграфіі XX – XXI стст., а таксама адраджэння вытворчасці слуцкіх паясоў на сучасным этапе.

Вучэбная дысцыпліна звязана адзінай канцэпцыяй, прынцыпамі адбору і выкладання матэрыялу. Структура дысцыпліны суадносіцца з прынцыпамі гістарызму, вызначаецца адпаведнасцю гістарычнай рэчаіснасці.

*Аб'ектамі вывучэння* з'яўляюцца: слуцкія паясы і іх вытворчасць на шаўкаткацкай мануфактуры ў Слуцку ў XVIII – пачатку XIX ст., кунтушовыя паясы, створаныя на мануфактурах Персіі і Асманскай імперыі ў XVII–XVIII стст., Рэчы Паспалітай у XVIII – пачатку XIX ст., Францыі ў другой палове XVIII ст.; узоры слуцкіх паясоў і паясоў слуцкага тыпу з музейных збораў Беларусі, Польшчы, Расіі, Украіны, Літвы; кунтушовы строй беларускай магнатэрыі і шляхты XVII – пачатку XIX ст.; творы выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і сцэнаграфіі XX – XXI стст., у якіх выкарыстаны арнаментальныя матывы слуцкіх паясоў.

Вучэбная дысцыпліна «Слуцкі пояс: гісторыя і сучаснасць» арганічна звязана з шырокім колам спецыяльных дысцыплін: «Гісторыя мастацтваў», «Гісторыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва», «Гісторыя Беларусі», «Музеязнаўства» і інш. Важнай часткай паспяховай падрыхтоўкі студэнтаў з'яўляецца знаёмства з аўтэнтычнымі ўзорамі слуцкіх паясоў у музейных экспазіцыях рэспублікі і падчас іх экспанавання на часовых выстаўках з музейных збораў іншых краін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мэта* вучэбна-метадычнага комплекса – выпрацоўка цэласнай сістэмы ведаў пра культурны феномен, выдатныя помнікі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і нацыянальны сімвал Беларусі – слуцкія паясы.

*Асноўнымі задачамі* ВМК па дысцыпліне «Слуцкі пояс: гісторыя і сучаснасць» з'яўляюцца:

– раскрыццё агульных тэндэнцый гісторыі стварэння, вытворчасці і бытавання слуцкіх паясоў; адметных асаблівасцей іх мастацкай мовы; гістарычнай заканамернасці калекцыяніравання і музеефікацыі слуцкіх паясоў, спецыфікі адраджэння вытворчасці слуцкіх паясоў на сучасным этапе;

– раскрыццё шляхоў фарміравання ў беларускай культуры нацыянальнага сімвала – слуцкага пояса;

– вызначэнне ролі кунтушовага пояса ў шляхецкім строі і яго месца ў гісторыі беларускага касцюма;

– знаёмства з вопытам выкарыстання і стылізацыі дэкаратыўных матываў слуцкага пояса ў беларускім мастацтве;

– фарміраванне і развіццё гістарычнага, культуралагічнага і мастацкага мыслення студэнта праз засваенне прапанаванага матэрыялу;

– фарміраванне базы для практычнага ўкаранення атрыманых студэнтамі ведаў у прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці.

З ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання, якія адпавядаюць агульным патрабаванням да фарміравання прафесійнай кампетэнцыі студэнта, фарміраванню ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, вылучаюцца наступныя:

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;

– рэпрадукцыйныя метады (расказ, тлумачэнне, гутарка, дыскусія, лекцыя, дэманстрацыя кіна- і аўдыязапісаў);

– метады самастойнай работы студэнтаў (работа з першакрыніцамі);

– праблемныя (творчы дыялог, назіранне);

– кантрольна-ацэначныя метады.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае вывучэнне асобных тэм і раздзелаў дысцыпліны з выкарыстаннем метадычных рэкамендацый і літаратуры, рэкамендаванай выкладчыкам. Кантроль самастойнай работы студэнтаў адбываецца перыядычна падчас аўдыторных заняткаў.

Вучэбная дысцыпліна «Слуцкі пояс: гісторыя і сучаснасць» вывучаецца на працягу аднаго семестра ў аб'ёме 52 гадзін, з якіх 36 гадзін – аўдыторныя заняткі (26 г. – лекцыі, 10 г. – семінары).

Рэкамендуемая форма кантролю ведаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 Навучальны дапаможнік па дысцыпліне «Слуцкі пояс: гісторыя і сучаснасць»

1. Слуцкі пояс: гісторыя і сучаснасць : вучэб. дапаможні. / В.А. Лабачэўская [і інш.]. – Мінск : РІВШ, 2016. – 278 с. : іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2.2 Канспекты (тэксты лекцый)

УВОДЗІНЫ

Пытанні

1. Прадмет вывучэння. Задачы курса.
2. Актуальнасць вывучэння вывучэння гісторыі і мастацтва слуцкіх паясоу, як нацвянальнага сімвала беларусаў.

1. **Прадмет вывучэння. Задачы курса.**

Слуцкія паясы – унікальная гістарычна-культурная з’ява, якая сфарміравалася ў выніку асаблівых умоў гістарычнага, культурнага, грамадска-палітычнага развіцця беларускіх зямель у перыяд XVII – пачатку XIX стагоддзя ў складзе Рэчы Паспалітай абодвух народаў (Вялікага княства Літоўскага і Кароны Польскай) і Расійскай імперыі. Слуцкія паясы, якія вылучаюцца адметнымі вобразна-пластычнымі рысамі, уяўляюць выключны феномен у гісторыі развіцця айчыннага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і арганічна ўпісаны ў кантэкст развіцця еўрапейскай культуры і мастацтва.

Слуцкія паясы з канца XIX ст. былі прызнаныя ўнікальнымі творамі дэкаратыўнага мастацтва і сталі гонарам музеяў і прыватных калекцый. Для беларусаў у XX ст. слуцкія паясы сталі нацыянальнай рэліквіяй, з’явай айчыннай мастацкай культуры, яскравым сімвалам самавызначэння нацыі. Слуцкія паясы маюць важнае этнамаркіруючае значэнне для вызначэння прысутнасці беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў сучаснай еўрапейскай і сусветнай культурнай прасторы. Для Беларусі слуцкія паясы – сапраўдны ўзор нацыянальнага гонару, сімвал годнасці нацыі.

На дзяржаўным узроўні сёння пастаўлены задачы прапаганды слуцкіх паясоў як культурнага і ідэалагічнага складніка нацыянальнай ідэі, адраджэння вытворчасці іх копій і сучасных аналагаў, выкарыстання мастацкіх стылізацый слуцкага арнаменту у сувенірнай прадукцыі, што павінна адыграць значную ролю ў сучасным сацыяльна-культурным жыцці Беларусі, выконваць прадстаўнічыя функцыі, знаходзіць ужытак у музейнай і сцэнічнай практыцы, садзейнічаць узбагачэнню асартыменту тавараў айчыннай лёгкай прамысловасці, турыстычнай сферы, развіццю народных промыслаў (рамёстваў). Выкарыстанне патэнцыялу знакамітага артэфакта беларускай культуры – слуцкага пояса як нацыянальнага брэнда сувенірнай прадукцыі беларускіх мастацкіх промыслаў (рамёстваў) павінна ўплываць на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фарміраванне і ўмацаванне станоўчага міжнароднага іміджу Рэспублікі Беларусь.

2. **Актуальнасць вывучэння вывучэння гісторыі і мастацтва слуцкіх паясоу, як нацвянальнага сімвала беларусаў.**

Выкананне гэтых дзяржаўных задач патрабуе правядзення мэтанакіраваных мастацтвазнаўчых, гістарычных, культуралагічных даследаванняў па шматаспектным вывучэнні слуцкіх паясоў, пошуку шляхоў больш шырокага ўкаранення ў сучаснай соцыякультурнай і творчай практыцы распазнавальных вобразных прыкмет слуцкага пояса як нацыянальнага сімвала і ўдасканалення сістэмы падрыхтоўкі адпаведных спецыялістаў у сістэме вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

На сённяшні дзень у рэспубліцы адсутнічае сістэма падрыхтоўкі кадраў для ўстаноў культуры, прафесійна падрыхтаваных у пытаннях тэорыі і практыкі вывучэння, захавання і выкарыстання слуцкіх паясоў, іх творчай стылізацый. Актуальнай застаецца патрэба ў спецыялістах для экспертна-атрыбуцыйнай, навукова-фондавай, экспазіцыйна-выставачнай, навукова-асветніцкай дзейнасці музеяў краіны, кансервацыі і рэстаўрацыі слуцкіх паясоў і іншых мастацкіх тканін XVII–XIX стст. Адсутнічаюць спецыялізаваныя навучальныя праграмы і вучэбна-метадычныя дапаможнікі па мастацтве слуцкіх паясоў. Таму даследаванне слуцкага пояса як нацыянальнай рэліквіі беларускага народа з'яўляецца актуальным і сацыяльна значным, мае важнае тэарэтычнае і практычнае значэнне.

Усё гэта паслужыла падставай для распрацоўкі вучэбнай праграмы і стварэння вучэбнага дапаможніка па дысцыпліне "Слуцкі пояс: гісторыя і сучаснасць" мастацтвазнаўчай і культуралагічнай накіраванасці для падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў галіне гісторыі мастацтва, музейнай практыкі, культуралогіі, народнай творчасці, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Вучэбны дапаможнік арыентаваны на тэарэтычнае і метадалагічнае забеспячэнне вучэбнага працэсу ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных установах Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

## Раздзел I
## ФЕНОМЕН СЛУЦКАГА ПОЯСА Ў ГІСТОРЫІ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ XVIII – XIX СТСТ.

### Тэма 1. **Гісторыя ткацкай мануфактуры паясоў у Слуцку**

Пытанні



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Сарматызм як сацыякультурны феномен Рэчы Паспалітай і яго ўплыў на беларускую мастацкую культуру XVII–XVIII стст.
2. Імпарт кунтушовых паясоў усходняй вытворчасці на землі Рэчы Паспалітай у XVI – першай палове XVIII ст.
3. Станаўленне вытворчасці кунтушовых паясоў у Рэчы Паспалітай у першай палове – сярэдзіне XVIII ст.
4. Першыя персіярні Рэчы Паспалітай у Станіславе і Бродах, іх вырабы.
5. Заснаванне радзівілаўскіх майстэрань кунтушовых паясоў у Нясвіжы і Слуцку.
6. Бацька і сын Ян і Лявон Маджарскія ў гісторыі слуцкай мануфактуры.
7. Асноўныя этапы і галоўныя факты гісторыі ткацкай мануфактуры паясоў у Слуцку ў 1760–1807 гг.
8. Уплыў слуцкай мануфактуры паясоў у 1780–1790-х гг. на дзейнасць іншых персіярняў Рэчы Паспалітай.
9. Меткі-сігнатуры на слуцкіх паясах.

Літаратура:

Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. / рэдкал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987–1994. – Т. 2: Другая палова XVI – канец XVIII ст. / Я.М. Сахута. – 1988. – 384 с.

Ельскі, А. Гістарычныя звесткі пра радзівілаўскую ткальню паясоў у Слуцку / А. Ельскі // Выбранае. – Мінск: «Беларускі кнігазбор», 2004. – С. 65-86.

Клімуць, Л.Я. Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI - XVIII стагоддзях / Л. Я. Клімуць. – Мінск : Беларусь, 2013. – 127 с.

Лазука, Б.А. Слуцкія паясы: адраджэнне традыцый / Б.А. Лазука. – Мінск: Беларусь, 2013. – 127 с.: іл.

Мальдзіс, А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: Нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1982. – 256 с.

Якуніна, Л.І. Слуцкія паясы / Л.І. Якуніна. – Мінск: Выдавецтва Акадэміі Навук Беларусі, 1960. – 238 с.

## 1. Сарматызм як сацыякультурны феномен Рэчы Паспалітай і яго ўплыў на беларускую мастацкую культуру XVII–XVIII стст.

З канца XVI ст. ў шляхецкім асяроддзі Рэчы Паспалітай імкліва распаўсюджваецца выкарыстанне ў мужчынскім касцюме паясоў замежнай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

усходняй вытворчасці. Шаўковыя персідскія, турэцкія, кітайскія, індыйскія паясы, са срэбранымі і залатымі ніткамі, з адмысловымі арнаментамі і ўзорамі, у кароткі тэрмін амаль цалкам выцеснілі з ужытку магнатаў і шляхты сціплыя паясы мясцовага вырабу.

Пашырэнню новай моды ў значнай ступені садзейнічала ідэалогія сарматызму. Аснову сармацкай ідэалогіі складаў генеалагічны міф пра паходжанне шляхецкага саслоўя Польскага Каралеўства ад старажытных ваяўнічых сармацкіх воінаў, плямены якіх у колішнія часы нібыта заваявалі і падпарадкавалі карэннае насельніцтва на тэрыторыях будучай краіны і пачалі ўладарыць над ім. Нашчадкі заваяваных абарыгенаў – гэта людзі простых саслоўяў, а шляхта і магнаты – спадкаемцы слаўных сармацкіх ваяроў.

З канца XVI ст. – пасля смерці апошняга прадстаўніка каралеўскай дынастыі Ягелонаў Жыгімонта II Аўгуста (1520–1572), сарматызм набыў моцны саслоўны акцэнт, пачаў выкарыстоўвацца для абазначэння стылю жыцця, светасузірання і спосабу мыслення арыстакратыі і ўсяго шляхецкага стану, падкрэсліваючы яго грамадскую выключнасць і абумоўліваючы надзвычайныя палітычныя правы і вольнасці: выбіраць караля і бачыць у ім «самага першага сярод роўных, але не самага магутнага», вызначаць каралеўскія паўнамоцтвы і кантраляваць яго дзейнасць.

Сарматызм абвяшчаў роўнасць усіх прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя перад законам і іх аднолькавыя прывілеі, нягледзячы на палітычную ўплывовасць у дзяржаве і моцную маемасную дыферэнцыраванасць – і магнатаў, уладальнікаў вялізных латыфундый, і дробную «шарачковую», «загонную» шляхту.

Арыенталізм (з лац. Oriens – усход) – арыентацыя на ўсходнія ў першую чаргу турэцкія, персідскія ўзоры культуры і мастацтва, быў часткай культуры і побыту шляхты. Жыхарам беларускіх зямель ў часы Вялікага княства Літоўскага былі добра знаёмыя ўсходнія тканіны (ядваб, бавоўна), адзенне і яго крой, зброя, рэчы (дываны, шатры, біруза і інш.), а з далёкіх Англіі, Францыі, Іспаніі экспартаваліся пераважна ваўняныя і льняныя тканіны. Жупан, кунтуш, багатыя ўсходнія тканіны для іх пашыву, шаўковыя ўсходнія паясы шырока распаўсюдзіліся ў Вялікім княстве Літоўскім дзякуючы шчыльным гандлёвым узаемасувязям з усходнімі краінамі, перыядычным ўзрастаннем імпарту з краін Усходу, вайсковым паходам.

Шаўковы ўзорыстатканы пояс таксама трапіў у гэты пералік і да пачатку XVII ст. быў абвешчаны адным з абавязковых сармацкіх прадметаў. Абкручаны на стане паверх кунтуша – кунтушовы пояс наглядна дэклараваў шляхецкую годнасць, высокі сацыяльны і маёмасны статус свайго ўладара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. Імпарт кунтушовых паясоў усходняй вытворчасці на землі Рэчы Паспалітай у XVI – першай палове XVIII ст.

Гандаль усходнімі таварамі здзяйсняўся ў Рэчы Паспалітай пераважна праз Галіцыю – адну з самых эканамічна развітых абласцей краіны. Важную ролю ў распаўсюджанні ўсходніх тавараў менавіта на беларускіх землях Вялікага княства Літоўскага выконваў і іншы гандлёвы шлях, які ішоў з Кракава на Люблін, а адтуль на Брэст, Вільню, Пінск. З XVI ст. гандаль з краінамі Усходу ў Рэчы Паспалитай амаль адзінпалічна вялі армянскія купцы.

З XVI ст. адным з галоўных відаў армянскага тавару становяцца ўсходнія шаўковыя паясы. Раней за іншыя ў купечаскіх рэестрах, што фіксуюць гандлёвыя абароты, згадваюцца «cingaturae Turcarum» – турэцкія паясы, якія дастаўляліся з Бурсы (Брусы), Ангоры (Анкары) і Стамбула. З сярэдзіны XVII ст. побач з турэцкімі шырокае распаўсюджанне ў Рэчы Паспалітай атрымліваюць паясы персідскія, дастаўленыя як са стамбульскіх кірмашоў, так і непасрэдна з Персіі, найперш з Ісфахана.

Асартымент прывазных паясоў быў разлічаны на розныя фінансавыя магчымасці патэнцыяльных пакупнікоў. Самымі дарагімі былі так званыя «багатыя» або «літыя» паясы, цалкам вытканыя з шаўковых і металічных срэбраных ці залотных (срэбраных пазалочаных) нітак. Менш каштавалі «паўлітыя» паясы, у якіх срэбраныя ці залотныя ніткі дадаваліся да шаўковых толькі ў асобных элементах арнаментальна-расліннага дэкору. Яшчэ больш таннымі былі проста шаўковыя паясы. А для самых бедных прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя купцы прывозілі паясы «старыя, ужо раней ужываныя, але старанна зашытыя, выпраныя і адпрасаваныя», коштам у чатыры – шэсць дукатаў.

Армянская вытворчасць шаўковых паясоў. На сеняшні дзень у Беларусі захоўваецца толькі адзін вялікі фрагмент стамбульскага армянскага пояса, ён знаходзіцца ў прыватным зборы.

## 3. Станаўленне вытворчасці кунтушовых паясоў у Рэчы Паспалітай у першай палове – сярэдзіне XVIII ст.

Сярод разнастайных майстэрань і мануфактур у Рэчы Паспалітай, што засноўваліся пры падтрымцы магнатаў, аднымі з самых шматлікіх былі гэтак званыя персіярні, якія спецыялізаваліся на вытворчасці шаўковых паясоў. Вялікі попыт на кунтушовыя паясы, высокі кошт усходніх паясоў, які шматразова павялічваўся дзякуючы значным накладным выдаткам, з’яўляліся істотнымі пабуджальнымі фактарамі для спроб наладзіць вытворчасць паясоў непасрэдна ў краіне.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спецыфіка вырабу мастацкага тэкстыля патрабавала неабходнага абсталявання, прыдатных матэрыялаў, кваліфікаваных майстроў. І хаця на беларускіх землях ужо ў XI ст. існавалі традыцыі ўзорыстага ткацтва, а ў XIII–XVII стст. у многіх гарадах і мястэчках і пры манастырах дзейнічалі ткацкія майстэрні, вытворчасць менавіта шаўковых тканін была справай зусім новай і невядомай. Для вытворчасці кунтушовых паясоў усходняга тыпу не хапала ведаў мясцовых майстроў у галіне тэхналогіі ткацтва, не падыходзілі мясцовыя сыравіна і ткацкае абсталяванне. Фактычна, для арганізацыі персіярні патрабавалася прывезці з краін Усходу шоўк і металічныя ніткі, спецыяльныя ткацкія станкі – варштаты і іншыя прыстасаванні, а таксама запрасіць іншаземных мастакоў-тэхнолагаў, спрактыкаваных у падрыхтоўцы эскізаў для тканін і ў тэхналогіі шоўкаткацтва. У выніку з улікам усіх выдаткаў кошт мясцовай гатовай прадукцыі атрымліваўся ненашмат меншым за кошт імпартных усходніх паясоў.

Тым не менш, у сярэдзіне – другой палове XVIII ст. персіярні адкрываюцца ў многіх гарадах і мястэчках Рэчы Паспалітай: Станіславе, Бродах, Корцы (Украіна), Нясвіжы, Слуцку, Ружанах, Паставах, Гродна (Беларусь), Сакалове, Кабылцы, Ліпкаве, Кракаве, Гданьску, Дрэвіцы (Польшча) і іншых.

## 4. Першыя персіярні Рэчы Паспалітай у Станіславе і Бродах, іх вырабы.

Першыя мануфактуры кунтушовых паясоў у Рэчы Паспалітай з’явіліся на тэрыторыі сучаснай Украіны: у Станіславе (зараз Івана-Франкоўск) і Бродах – гарадах, дзе яшчэ з XVII ст. існавалі вялікія армянскія грамады, прадстаўнікі якіх несумненна прымалі самы актыўны ўдзел у арганізацыі вытворчасці, а магчыма, былі і ініцыятарамі заснавання прадпраемстваў.

Надзвычайную ролю ў дзейнасці станіслаўскай і бродскай майстэрань адыграў выхадзец з Асманскай імперыі армянін Дамінік Місеровіч – кіраўнік і верагодны ўладальнік гэтых персіярань.

У персіярнях у Станіславе і Бродах умелі ткаць двухбаковыя паясы па ўзору ўсходніх армянскіх, прычым не толькі проста шаўковыя, але і «літыя». Дзейнасць прадпрыемстваў Станіслава і Бродаў паспрыяла станаўленню персіярскай справы ў Рэчы Паспалітай. Тут быў упершыню засвоены вопыт усходніх ткацкіх мануфактур і выраблены першыя ў Рэчы Паспалітай кунтушовыя паясы. Гэтыя майстэрні сталі своеасаблівым «перавалачным пунктам» для ўсходніх ткачоў, выхадцаў з Асманскай імперыі, якія ў пошуках лепшай долі перасяляліся на ўкраінскія, беларускія, польскія землі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вядома, што ў Станіславе пачынаў сваю дзейнасць славуты армянскі майстар Аванэс Маджаранц, з імем якога звязана вытворчасць знакамітых слуцкіх паясоў. Акрамя таго, на станіслаўскай мануфактуры праходзілі навучанне вучн з розных куткоў Рэчы Паспалітай, як, напрыклад, ткачы з Нясвіжа, накіраваныя сюды князем Міхаілам Казімірам Радзівілам.

**5. Заснаванне радзівілаўскіх майстэрань кунтушовых паясоў у Нясвіжы і Слуцку.**

У другой чвэрці – сярэдзіне XVIII ст. дзве майстэрні па вытворчасці кунтушовых паясоў былі заснаваны на тэрыторыі сучаснай Беларусі ва ўладаннях князеў Радзівілаў, родных братоў, Міхаіла Казіміра Радзівіла (1702–1762) і Гераніма Фларыяна Радзівіла (1715–1760) – у Нясвіжы і Слуцку.

У 1757 г. нясвіжскія ткачы Томаш Хаецкі і Ян Гадоўскі былі накіраваны ў Станіслаў для вывучэння працэсу вытворчасці шаўковых паясоў. Акрамя таго, Міхаіл Казімір Радзівіл вёў актыўны пошук іншаземных майстроў, якія былі б здатнымі ўзначаліць персіярню і арганізаваць яе работу.

**6. Бацька і сын Ян і Лявон Маджарскія ў гісторыі слуцкай мануфактуры.**

Вырашальным момантам у дзейнасці радзівілаўскіх прадпрыемстваў стаў прыезд у Нясвіж таленавітага армянскага мастака-тэкстыльшчыка і ткача-тэхнолага Аванэса Маджаранца (на Беларусі яго імя пераўтварылася ў Яна Маджарскага), запрошанага Міхаілам Казімірам Радзівілам на пасаду кіраўніка мануфактуры. Паходжанне і біяграфія Яна Маджарскага.

Дамова 24 студзеня 1758 г. паміж Міхаілам Казімірам Радзівілам і Янам Маджарскім, падпісаная ў Нясвіжскім замку. Гэта дамова распачала новы этап у дзейнасці радзівілаўскай мануфактуры. Дзякуючы намаганням майстра Маджарскага, нясвіжская персіярня стала ператварацца ў адно з вядучых прадпрыемстваў Рэчы Паспалітай па вытворчасці кунтушовых паясоў.

Уцёкі Ян Маджарскі разам з двума працаўнікамі мануфактуры ў маі 1761 г. і іх вяртанне.

Злучэнне ў 1762 г. нясвіжскай і слуцкай мануфактур у адну фабрыку ў Слуцку. Прычыны злучэння.

На працягу доўгай гісторыі (апошнія звесткі пра фабрыку датуюцца 1846 г.) дзейнасць слуцкай персіярні не была роўнай – яна ведала перыяды ўздымаў і перажывала крызісы. Самыя значныя поспехі і дасягненні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадпрыемства прыйшліся на час, калі яго ўзначальвалі спачатку Ян Маджарскі, а потым ягоны сын Лявон – на 1762–1807 гг. Менавіта Маджарскія на аснове дэкору ўсходніх тканін распрацавалі самабытны і адметны мастацкі стыль слуцкіх паясоў, які арганічна злучыў традыцыі ўсходняга і заходнееўрапейскага тэкстыльнага мастацтва з элементамі арнаментальнай культуры беларускіх зямель. Намаганнямі Маджарскіх сакрэты ўсходняй тэхналогіі ручнога ткацтва засвоілі дзесяткі мясцовых ткачоў, дзейнасць якіх паспрыяла станаўленню беларускага мастацкага шаўкаткацтва ўцэлым.

**7. Асноўныя этапы і галоўныя факты гісторыі ткацкай мануфактуры паясоў у Слуцку ў 1760–1807 гг.**

Беларускія ткачы – працаўнікі слуцкай персіярні. Працаўнікамі слуцкай мануфактуры амаль што выключна былі мужчыны, як гэта было прынята ў спецыялізаваным прафесійным ткацкім рамястве ў краінах Усходу і Заходняй Еўропы. Нешматлікія жанчыны выконвалі толькі асобныя дапаможныя аперацыі, напрыклад, навівалі шоўк на цэўкі для ткацкіх чаўнакоў. Параўноўваючы прозвішчы, згаданыя ў дакументах розных часоў, можна сцвярджаць, што многія майстры працавалі на мануфактуры на розных пасадах на працягу ўсяго жыцця, некаторыя з іх маглі састаяць паміж сабою ў роднасных адносінах.

Організацыя работы на мануфактуры. Прыкладны аб’ём штогадовай прадукцыі слуцкай мануфактуры ў 1760–1790-х гг. складаў да 200 шаўковых і літых паясоў. Арэнда мануфакутуры Янам Маджарскім з 1770-х гг. У канцы 1770-х гг. Ян Маджарскі перадаў кіраўніцтва мануфактурай і права яе арэнды свайму сыну Лявону, які, як бачна, ужо дасягнуў неабходнай майстэрскай і творчай сталасці, каб паспяхова прадоўжыць сямейную справу, спачатку, верагодна, пад наглядам бацькі, а потым – самастойна.

Апошняя згадка ў дакументах пра Яна Маджарскага датуецца 1796 г. Лявон Маджарскі падаўжаў арэндаваць слуцкую мануфактуру да 1807 г. Слуцкая мануфактура паясоў у 1807–1846 гг.

**8. Уплыў слуцкай мануфактуры паясоў у 1780–1790-х гг. на дзейнасць іншых персіярняў Рэчы Паспалітай.**

Дасканалыя ў мастацкіх і тэхналагічных адносінах, слуцкія паясы сталі заслужана лічыцца лепшымі кунтушовымі паясамі ў Рэчы Паспалітай. Менавіта ў гэты час для многіх вытворцаў паясоў вырабы слуцкай персіярні зрабіліся эталонам, іх выяўленчыя матывы сталі актыўна выкарыстоўвацца ў якасці ўзораў для пераймання на многіх тэкстыльных прадпрыемствах.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уплыў слуцкай мануфактуры паясоў у 1780–1790-х гг. на дзейнасць іншых персіярняў Рэчы Паспалітай. Пасхаліс Якубовіч і яго роля ў вытворчасці паясоў слуцкага тыпу на Ліонскай ткацкай мануфактуры Гійо, Жэрмена і Дэшазэля. Паясы, вытканыя з выкарыстаннем дэкаратыўных матываў слуцкай мануфактуры, прынята называць паясамі “слуцкага тыпу”.

**9. Меткі-сігнатуры на слуцкіх паясах.**

Слуцкія паясы мелі ўласныя меткі – гарадскія і імянныя, якія звычайна вытыкаліся на канцах тканіны ў вуглах шлячкоў у прамым і люстэркавым выглядзе. Розным меткам адпавядаюць розныя перыяды дзейнасці мануфактуры, і ў адпаведнасці з вытканай сігнатурай слуцкія паясы магчыма дастаткова дакладна датаваць.  Меткіі на лацінцы, польсквй мове, на кірыліцы.

Такім чынам, у другой палове XVIII – пачатку XIX ст. пад уздзеяннем сармацкай ідэалогіі і моды на арыенталізм у карыстанне магнатаў і шляхты Рэчы Паспалітай трапілі шаўковыя ўзорыстатканыя паясы ўсходняй вытворчасці, якія на працягу канца XVI – першай паловы XVIII стст. мэтанакіравана і ў вялікім аб’ёме імпартаваліся ў Рэч Паспалітую з Персіі, Асманскай імперыі, Індыі і Кітая. Пасля сканчэння Паўночнай вайны, у другой чвэрці XVIII ст. у краіне склаліся спрыяльныя ўмовы для ўзнікнення краёвых мануфактур па вырабу разнастайных прадметаў і твораў дэкаратыўна-прыкладного мастацтва, у тым ліку і па вытворчасці кунтушовых паясоў – персіярань. У другой палове – канцы XVIII ст. на тэрыторыі Рэчы Паспалітай дзейнічала больш за дваццаць персіярань, самай знакамітай сярод якіх была слуцкая фабрыка.

Тэма 2. **Мастацка-кампазіцыйныя асаблівасці і арнамент слуцкіх паясоў**

Пытанні:

1. Кампазіцыйная структура слуцкага пояса.
2. Стылістычныя асаблівасці слуцкіх паясоў перыяду росквіту мануфактуры.
3. Тыпалогія арнаментальных матываў і кампазіцый “галоў” слуцкіх паясоў.
4. Асноўныя рашэнні дэкору сярэдніка і бардзюраў слуцкіх паясоў.
5. Тэхналогія ткацтва і матэрыялы для вырабу слуцкіх паясоў.
6. Класіфікацыя слуцкіх паясоў паводле тэхнічных прыёмаў стварэння малюнка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура:

Гісторыя беларускага мастацтва: У 6 т. Т. 2 : Другая палова XVI – канец XVIII ст. / Рэдкал. : С. В. Марцэлеў і інш.; Рэд. тома Я. М. Сахута. – Мінск : Навука і тэхніка, 1998. – 384 с.

Лазука, Б. А. Слуцкія паясы: адраджэнне традыцый / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2013. – 127 с. : іл.

Кацер, М.С. Народно-прикладное искусство Белоруссии от первобытного общества до 1917 года / М.С. Кацер. – Минск : Вышэйшая школа, 1972. – 173 с.

Слуцкія паясы. Альбом-каталог выставы 29 верасня 2005 г. – 31 студзеня 2006 г. / уклад. І. Зварыка. – Мінск : «Юніпак», 2008. – 71 с.

Слуцкія паясы і літургічнае адзенне са збораў Нацыянальнага музея ў Варшаве і Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Каталог выстаўкі 5 лістапада 2014 – 6 красавіка 2015 г. / аўт. тэкстаў, складальнікі Э. Арлінська-Мяноўска [і інш.]. – Мінск : Першая ўзорная друкарня, 2014. – 82 с.

Якуніна, Л.І. Слуцкія паясы / Л.І. Якуніна. – Мінск : Выд.-ва Акадэміі навук БССР, 1960. – 238 с.

**1. Кампазіцыйная структура слуцкага пояса.**

Мастацка-стылістычныя асаблівасці і тэхналогія слуцкіх паясоў склаліся пад моцным уплывам усходніх тканін. На пачатку станаўлення персіярскай справы галоўнай задачай, што ставілася перад кіраўнікамі і майстрамі ткацкіх майстэрань, іх гаспадарамі і фундатарамі, было патрабаванне зрабіць паясы, падобныя да прывазных персідкіх і турэцкіх, якія лічыліся эталонам дасканаласці. З паясоў усходніх была цалкам запазычана агульная кампазіцыйная структура слуцкага пояса, якая заставалася нязменнай на ўсім працягу дзейнасці персіярні. Пояс складаецца з трох выразна абазначаных кампанентаў – двух роўнавялікіх канцоў (іх яшчэ называюць «галовамі» пояса) і выцягнутай цэнтральнай часткі – так званага «сярэдніка». Палі галоў і сярэдніка па перыметры акантаваны арнаментальнымі бардзюрамі-шлячкамі, прычым шлячкі, што ідуць уздоўж тканіны, заўседы шырэйшыя за папярочныя.

Сярэдняя даўжыня слуцкага пояса вагаецца ад трох да чатырох з паловай метраў, шырыня – прыкладна 30–35 сантыметраў. Адносна агульных памераў пояса параўнаўча невялікай з'яўляецца вышыня галоў – у сярэднім каля 20 сантыметраў. Канцы слуцкіх паясоў аздоблены прышыўнымі махрамі, якія надаюць мастацкаму вобразу выраба завершанасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разам з тым, агульная стылістыка дэкору ранніх вырабаў слуцкай мануфактуры мае некалькі дастаткова яркіх адметных рыс, паходжанне якіх ёсць сэнс шукаць у еўрапейскай мастацкай культуры. Малюнак выяўленчых матываў дакладны і лаканічны, з меншай колькасцю, у параўнанні з усходнімі тканінамі, дэталяў, што робіць усё адлюстраванне больш натуральным і рэалістычным, збліжае яго з пострэнесансным мастацтвам Рэчы Паспалітай. Вельмі цікавую трактоўку маюць выявы кветак, нібыта змазаікаваныя з паасобных жорстка аконтураных шматкутнікаў, вобразнае рашэнне якіх выклікае аналогіі з творамі старажытнабеларускага ювелірнага мастацтва, выкананымі ў тэхніцы перагародчатай эмалі, або вітражамі.

Такім чынам, ужо ў першых вырабах слуцкай мануфактуры прасочваецца працяг мастацкай трансфармацыі выяўленча-пластычнай мовы кунтушовага паясу, распачатый яшчэ ў армянскіх майстэрнях Стамбула і прадоўжаны на першых персіярнях Рэчы Паспалітай у Станіславе і Бродах. Менавіта ў Слуцку мастацкі вобраз шаўковага пояса прыводзіцца ў адпаведнасць з патрабаваннямі мастацкага густу шляхты Рэчы Паспалітай – жыхароў культурнага памежжа Усходу і Захаду. Параўнаўча хутка – прыкладна ў пачатку 1770-х гг., гэты працэс прывядзе да стварэння адметнага и дасканалага тыпу кунтушовага пояса – слуцкага, які, у сваю чаргу, будзе вызначаць асаблівасці вырабаў большасці персіярань Рэчы Паспалітай, і будзе ўспрыняты як класічны прыклад так званага «польскага кунтушовага пояса».

2. **Стылістычныя асаблівасці слуцкіх паясоў перыяду росквіту мануфактуры.**

У 1770-х гг. мастацкая стылістыка слуцкіх паясоў імкліва эвалюцыяніруе. Паясы набылі гарманічныя суадносіны частак, выпрацавалася выразная структура арнаменту. Лік арнаментальных матываў на канцах абмяжоўваецца двума, як рэдкае выключэнне сустракаюцца паясы з адным або з трыма матывамі. Павялічваецца ступень складанасці і ўзровень стылізацыі арнаментаў, канчаткова фарміруюцца галоўныя прынцыпы іх формаўтварэння; істотна, у параўнанні з раннімі вырабамі фабрыкі, пашыраецца каларыстычная гама тканін.

Дэкор слуцкіх паясоў перыяду росквіту мануфактуры (1770–1790-я гг.).

3. **Тыпалогія арнаментальных матываў і кампазіцый “галоў” слуцкіх паясоў.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мэтазгодным прадставіць усю разнастайнасць дэкаратыўна-арнаментальных кампазіцый канцоў слуцкіх паясоў у выглядзе дзвюх вялікіх груп.

Да ***першай групы*** адносяцца паясы з дэкорам у выглядзе двукратнага паўтору выяў дрэўцаў ці больш сціплых раслінных кусцікаў, строга сіметрычных адносна вертыкальнай восі сіметрыі, расквечаных стылізаванымі кветкамі гваздзікоў, лотацяў, лілей, півоняў, валошак, шыпшыны, лёну і інш., розных памераў, пададзеных у фас ці профіль.

Да **другой групы** адносяцца слуцкія паясы з арнаментацыяй канцоў у выглядзе двухразовага паўтарэння выяў дэкаратыўных медальёнаў – раслінна-кветкавых або стужкавых.

Да групы вырабаў слуцкай мануфактуры з дэкорам у выглядзе медальёнаў могуць быць далучаны паясы з кампазіцыямі на канцах у выглядзе двухразовага паўтору адлюстравання двух гнуткіх парасткаў, уквечаных буйнымі моцна стылізаванымі кветкамі, якія прарастаюць з засохлых пнёў.

**3. Асноўныя рашэнні дэкору сярэдніка і бардзюраў слуцкіх паясоў.**

На ўсім працягу дзеяння слуцкай мануфактуры пад кіраўніцтвам Яна і Лявона Маджарскіх, арнаментацыя поля сярэдніка зводзілася да **трох асноўных варыянтаў**, кожны з якіх меў некалькі асобных мадыфікацый.

**Першы** запазычаны з персідскага тэкстылю. Ён мае назву «карпавая луска», якую візуальна нагадвае сваім малюнкам.

**Другі** варыянт дэкаратыўнага вырашэння сярэдніка ў выглядзе папярочных палос роўнай або прыкладна роўнай шырыні таксама мае ўсходняе паходжанне.

**Трэці** варыянт дэкору сярэдніка сустракаецца ў вырабах слуцкай персіярні дастаткова рэдка. Ён мае выгляд манахромнага поля, праз роўныя прамежкі ўпрыгожанага радамі вялікіх кружкоў.

**4. Тэхналогія ткацтва і матэрыялы для вырабу слуцкіх паясоў.**

Слуцкія паясы – гэта ўнікальныя помнікі прафесійнага ручнога ткацтва, якія паводле асаблівасцей сваёй вытворчасці прынцыпова адрозніваюцца ад твораў народнага ткацтва, якое практыкавалася ў сялянскім асяроддзі і майстэрнях местачковых рамеснікаў. Па-першае, слуцкія паясы вырабляліся выключна з шаўковых ці шаўковых і металічных нітак, што вымагала асаблівага майстэрства пры стварэнні вытанчаных малюнкаў. Па-другое, у запраўцы на варштаце павінна было быць два ткацкіх навоя для двух відаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асноў, кожная з якіх у тканіне выконвала сваю функцыю, але не прымала ўдзелу ў фарміраванні фона ці ўзораў, як адбываецца ў вырабах народнага ткацтва. Па-трэцяе, у абсалютнай большасці слуцкіх паясоў уткі пракладваліся не па ўсёй шырыні пояса, а на асобных яго частках: на палове, у шлячку-бардзюры. Гэта значыць, што адначасова на варштаце ўтваралася два ці чатыры зева, у кожны з якіх уток пракладваўся паасобна. У беларускім народным ткацтве такія прыемы не выкарыстоўваліся.

Слуцкія паясы выраблялiся на ручных ткацкіх станках у тэхніцы гэтак званага ўточнага габелена, якая дазваляе атрымаць усе каляровыя эфекты ў малюнку пояса выключна ніцямі ўтка. Уточны габелен – гэта тканіна, у структуру якой уваходзяць дзве сістэмы нітак асновы і некалькі сістэм уточных нітак (утка).

## 6. **Класіфікацыя слуцкіх паясоў паводле тэхнічных прыёмаў стварэння малюнка**

Паводле тэхнічных асаблівасцей стварэння малюнка і перапляцення нітак асноў і вуткоў слуцкія паясы падзяляюцца на наступныя віды:

- ***аднабаковыя адналіцавыя*** (ці аднавонкавыя). Такія паясы маюць вонкавы і адваротны бакі. Ва ўтварэнні тканіны ўдзельнічаюць дзве сістэмы нітак асновы – карэнная і прыціскная; дзве сістэмы ўточных нітак – грунтавыя, якія пракладваюцца па ўсей шырыні пояса і прымаюць удзел у стварэнні ўзора, і сістэма уточных нітак «брашэ». Уток «брашэ» пракладваецца толькі па адным баку пояса, які з’яўляецца вонкавым;

- ***аднабаковыя двухліцавыя*** (двухвонкавыя). Гэтыя паясы таксама маюць вонкавы і адваротны бакі. Але ў адрозненне ад папярэдняга тыпу тканін, грунтавыя ўткі пракладваюцца ў іх не па ўсей шырыні запраўкі варштата, а да паловы яе шырыні. Уток «брашэ» скарыстоўваўся ва ўзоры толькі на адным баку пояса – вонкавым. Такія паясы пры апярэзванні складваліся папалам па даўжыні тканіны, і кожная з паловаў аднога баку пояса магла выкарыстоўцца як вонкавая;

- ***двухбаковыя двухліцавыя*** (двухвонкавыя). У такіх паясах кожны бок вонкавы. Грунтавыя ўткі пракладваюцца па ўсёй шырыні запраўкі варштата, уток «брашэ» прысутнічае ў арнаменце на кожным з бакоў тканіны. Паясы гэтага віду маглі ткацца і без утка «брашэ», у гэтым выпадку адзін бок пояса па колеры з’яўляецца негатыўным адлюстраваннем другога боку;

- ***двухбаковыя трохліцавыя*** (трохвонкавыя). Гэтыя паясы, як і папярэднія, не маюць адваротнага боку. Але ў іх адзін грунтавы ўток пракладваецца па ўсей шырыні пояса, другі (двухкаляровы) пракладваецца да паловы, а уток «брашэ» – па абодвух баках пояса. Пояс такога віду мог



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстоўвацца і ва ўсю шырыню, і складзеным папалам, там, дзе кожная з палоў з’яўляецца вонкавай;

- ***двухбаковыя чатырохліцавыя*** (чатырохвонкавыя). У гэтых паясах грунтавыя ўткі чатырох адметных колераў пракладваюцца да паловы шырыні тканіны па два на кожным з бакоў. Уток «брашэ» прысутнічае на абодвух баках пояса. Кожная з паловаў абодвух бакоў пояса такога кшталту выкарыстоўвалася як вонкавая.

## Тэма 3. **Кунтушовы пояс у строі беларускай шляхты XVII - XVIII стст.**

Пытанні:

1. Жупанова-кунтушовы ўбор – строй шляхты як палітычнага народа.
2. Асноўныя кампаненты мужчынскага шляхецкага строю канца XVI – сярэдзіны XIX ст.
3. Крой і манера нашэння пары жупан-кунтуш. Варыянты апяразвання шаўковым поясам.
4. Жыццёвасць традыцыйнага строю шляхты ў XIX і пачатку XX ст.

Літаратура:

Адзенне // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 1 : А – Беліца / Беларус. энцыкл. ; рэдкал. : М.В. Біч [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 48–52.

Барвенава, Г.А. «Грайкія струны» слуцкіх паясоў. Рэфлексія мадэлі сусвету ў паласатых тканінах / Г.А. Барвенава // Роднае слова. – 2014.– № 11. – С. 68–71.

Бохан, Ю.М. Побыт феадалаў Вялікага княства Літоўскага ў XV – сярэдзіне XVII стагоддзя / Ю.М. Бохан, А.А. Скеп’ян. – Мінск : Беларусь, 2011. – 271 с.

Бялявіна, В.М. Мужчынскі касцюм на Беларусі / В.М. Бялявіна, Л.В. Ракава. – Мінск : Беларусь, 2007. – 303 с.

В граде Слуцке: фотаальбом / уклад. і аўтар прадмовы М.М. Яніцкая. — Мінск : Асобны, 2006. – 136 с.

Гісторыя беларускага мастацтва. – У 6 т. – Т. 2 : Другая палова XVI – канец XVIII ст. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – С. 128–283.

Жывапіс Беларусі XII–XVIII стагоддзяў / склад. : Н.Ф. Высоцкая, Т.А. Карповіч. – Мінск : Беларусь, 1980. – 315 с.

Клімуць, Л.Я. Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI - XVIII стагоддзях / Л. Я. Клімуць. – Мінск : Беларусь, 2013. – 127 с.

Мальдзіс, А.І. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі / А.І. Мальдзіс. –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск : Мастацкая літаратура, 2009. – С. 3–268.
Мерцалова, М.Н. Костюм разных времен и народов / М.Н. Мерцалова. – В 4-х т. – Т. 2. – Москва : Академия моды, 1996. – 430 с.
Піскун, Ю.А. Гісторыя касцюма Беларусі XIV–XVIII стагоддзяў : Вуч. дапам. для студэнтаў / Ю.А. Піскун. – Мінск : Акадэмія, 2004. – 111 с.
Тананаева, Л.И. Сарматский портрет / Л.И. Тананаева. – М. : Наука, 1979. – 303 с.
Партрэты паўстаньня : [фотаальбом : да 150-годзьдзя страты Кастуся Каліноўскага і задушэньня Паўстаньня 1863–1864 гадоў у Беларусі-Літве / аўт.-склад. : К. Янушкевіч, Я. Янушкевіч. – Ракаў : [б.в.], 2014. – 76 с.

1. **Жупанова-кунтушовы ўбор – строй шляхты як палітычнага народа.**

Гістарычныя строі з'яўляюцца неад'емнай часткай духоўнай, мастацкай, матэрыяльнай культуры народа. Комплексы адзення нясуць у сабе вобразны пачатак, адлюстроўваюць мастацкі вобраз эпохі, які выбудоўваецца ў адпаведнасці з ўяўленнямі чалавека пра сваё месца ў свеце, пастулатамі ідэалогіі пэўнага часу, а таксама паводле правілаў гармоніі, архітэктонікі і мастацкай кампазіцыі. Як творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва гістарычныя строі адлюстроўваюць стыль эпохі, як сацыяльная з'ява – ўвасабляюць уяўленні свайго часу пра вартасці чалавека, яго ўнутраную сутнасць і фізічнае аблічча

Слова «строй» азначае ансамбль адзення, які складаецца з розных кампанентаў касцюма, галаўнога ўбору, абутку, здымных упрыгожанняў і аксесуараў.

Комплекс адзення з жупанам, кунтушом і поясам прынята вызначаць як "жупанова-кунтушовы строй". Гэта адзін з гістарычных строяў, які ў перыяд з канца XVI да сярэдзіны XIX ст. на землях Вялікага княства Літоўскага і Польскай Кароны, з'яўляўся афіцыйнай адзнакай станавай прыналежнасці шляхты і выяўляў яе актыўную патрыятычную пазіцыю ў грамадстве.

У канцы XVII ст. склаўся традыцыйны шляхецкі мужчынскі строй, асноўнымі кампанентамі якога сталі «пара» – жупан і кунтуш. Закончаны выгляд строю надаў шаўковы пояс, апяразаны паверх кунтуша, які стаў абавязковай часткай, гучным колеравым акцэнтам, дамінантай кампазіцыі ўсяго комплексу

Убор, які насілі прадстаўнікі шляхты на беларускіх землях з канца XVI да сярэдзіны XIX ст., выконваў разнародныя функцыі: дэманстраваў статус свайго ўладальніка ў грамадстве, пацвярджаў яго станавую і нацыянальную прыналежнасць, наглядна азначаў асабісты поспех і заможнасць. Такі строй



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

задавальняў патрэбы шляхціца ў розныя моманты яго грамадскага і прыватнага жыцця. Адной з прычын папулярнасці жупановага строю была прыхільнасць да яго каралеўскіх асоб.

Нашэнне «свайго строю» – традыцыйнага жупанова-кунтушовага ўбору ў часы падзелаў Рэчы Паспалітай стала праявай патрыятызму. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай жупанова-кунтушовы строй з поясам выйшаў з шырокага ўжытку, але яго захоўвалі, апраналі падчас сямейных урачыстасцяў. Славутыя слуцкія паясы, якія ўжо не насілі, атаясамлівалі са славутымі часамі росквіту страчанай Радзімы.

## 2. **Асноўныя кампаненты мужчынскага шляхецкага строю канца XVI – сярэдзіны XIX ст.**

З канца XVI ст. шляхецкі ўбор складаўся з жупана, кашулі, нагавіц, ботаў, пояса, шапкі. У сярэдзіне XVII ст. паверх жупана пачалі апранаць кунтуш і апяразваць яго шаўковым поясам. З гэтага часу строй шляхты набыў завершанасць як цэласная сістэма і дасканалы мастацкі вобраз, як функцыянальна-ўтылітарны комплекс прадметаў адзення.

Жупан – адзін з самых старажытных кампанентаў беларускага шляхецкага строю. Мужчынскае адзенне, званае жупанам, было расхінутым, доўгім – троху ніжэй за калена або ўвогуле да сярэдзіны лыткі ці да шчыкалаткі, завужаным ў таліі і пашыраным долу. Яно зашпільвалася спераду ад шыі да пояса на густа пасаджаныя гузікі, мела доўгія завужаныя каля запясця рукавы (мал. 11). Жупан абавязкова апяразваўся поясам: скураным, плеценым або шырокім шаўковым. Калі ў сярэдзіне XVII ст. распаўсюдзіўся кунтуш, жупан утварыў з ім «пару» – кунтуш сталі апранаць паверх жупана. З тых часоў шырокім шаўковым поясам пачалі падпяразваць менавіта кунтуш. Пры гэтым жупан працягвалі насіць як асноўнае адзенне, нярэдка без кунтуша.

Кунтуш – мужчынская расхінутая верхняя вопратка, шчыльна скроеная па формах цела чалавека, з характэрнымі доўгімі не сшытымі па вертыкальнаму шву ад падпахі да локця рукавамі – «вылётамі». Кунтуш насілі толькі ў комплексе з жупанам у якасці ўрачыстага адзення.

Жупан у спалучэнні з кунтушом, аперазаным поясам, кашуля, нагавіцы, запраўленыя ў высокія скураныя боты, шапка з футравай аблямоўкай складалі асноўны касцюмны комплекс магнатэрыі, шляхты, эліты гараджан, чынавенства гарадскіх магістратаў у Рэчы Паспалітай.

## 3. **Крой і манера нашэння пары жупан-кунтуш. Варыянты апяразвання шаўковым поясам.**



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кунтуш апраналі заўсёды толькі ў комплексе з жупанам. Кунтуш часцей выконвалі з цямнейшай тканіны, чым жупан, яго тканіна павінна была гарманізаваць з колерам жупана. Алоўнай адметнасцю кунтуша былі доўгія рукавы.

У агульнай кампазіцыі жупанова-кунтушовага строю менавіта слуцкія паясы стваралі асабліва адметны дэкаратыўны акцэнт, дзякуючы сваёй выразнай кампазіцыйнай і колеравай структуры. Утылітарная і рэпрэзентатыўная функцыі пояса абумовілі яго метрычныя характарыстыкі і спосаб апяразвання. Апяразванне кунтушовым поясам насіла характар асаблівага рытуалу. Згодна традыцыі, якая склалася на беларускіх землях, пояс складалі па даўжыні і ўкладалі паверх жупана або кунтуша па лініі таліі або часцей трохі ніжэй, бліжэй да сцёгнаў. Стан абвіваўся поясам 2–5 разоў, што дыктавала яго даўжыню. Даўжыня слуцкага пояса вагаецца ад трох да чатырох з паловай метраў, шырыня 30–41 см. Жывапісныя партрэты шляхты – іканаграфічная крыніца ведаў аб нашэнні строя і варыянтах апяразвання поясам.

У ***першым варыянце*** канцы пояса завязваюць вузлом спераду пасярэдзіне мужчынскага стану, прапускаюць праз папярэдні віток пояса. «Галовы» аднолькавай даўжыні разводзяць, распраўляюць і выстаўляюць гарызантальна або спускаюць долу па баках. Такім спосабам падпяразвалі вузейшыя паясы – «паўпаскі».

У ***другім варыянце*** апяразвання поясам, які, мяркуючы па партрэтных выявах шляхты, быў шырока распаўсюджаны, канцы пояса не завязваюць, а маляўніча ўкладаюць спераду па цэнтры мужчынскай фігуры. Канцы пояса падкладаліся пад першы (або першы і наступны) віток пояса і выраўноўваліся. Гэта дазваляла размясціць малюнак «галоў» пояса па цэнтры стану, або бліжэй да бакоў.

## 5. Жыццёвасць традыцыйнага строю шляхты ў XIX і пачатку XX ст.

Традыцыя насіць нацыянальныя «свае строі» з кунтушовым поясам у Рэчы Паспалітай пачала знікаць у канцы XVIII ст. Гэта ў першую чаргу было выклікана палітычнымі абставінамі і прычынамі шырокага распаўсюджання тагачаснай заходнееўрапейскай мужчынскай моды. Заняпад кунтушовага строю прынята звязваць з перыядам праўлення апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага (1764–1795 гг.). На беларускіх землях па многіх прычынах кунтушовы строй праіснаваў яшчэ сто гадоў.

У 1791 г. ў Слуцку былі вытканыя паясы, якія называліся «пазітыўкамі». Зялёны колер сімвалізаваў надзею, вясну, травень-месяц і час

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пераменаў Такія паясы дэманстратыўна апраналі прыхільнікі Канстытуцыі 3 мая як знак пратэсту супраць расійскай агрэсіі.  Падчас паўстання Тадэвуша Касцюшкі 1794 г. паўстанцы насілі кунтушовыя мундуры, які сталі мундурамі супраціву. Традыцыя нашэння «свайго строю» з кунтушовым поясам аднавілася падчас паўстанняў 1830–1831 і 1863–1864 гадоў. Нягледзячы на забарону нашэння кунтушовага пояса, слуцкая мануфактура працягвала вырабляць іх да 1846 г., а шляхта ў ранейшы звычай апяразвала паясамі жупан і кунтуш.  У канцы ХІХ – пачатку ХХ ст. шляхта фатаграфавалася ў кунтушы і жупане з поясам і шабляй, чым падкрэслівала свой спрадвечны гонар, годнасць і вольнасць духу.

## Раздзел ІІ. СЛУЦКІ ПОЯС ЯК БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ СІМВАЛ У ХХ СТ.

Тэма 4. **Слуцкі пояс у нацыянальнай культуры Беларусі ХХ ст.**

Пытанні:

1. Паэтычны вобраз слуцкіх паясоў у вершы М. Багдановіча «Слуц¬кія ткачыхі» (1912).
2. Выкарыстанне арнаментальных матываў слуцкіх паясоў у кніжнай графіцы 1910–1920-х гг.
3. Вывучэнне слуцкіх паясоў Вацлавам Ластоўскім і Міколай Шчакаціхіным у Інстытуце беларускай культуры (1922–1929).
4. Выстаўка слуцкіх паясоў у Беларускім дзяржаўным музеі (1927).
5. Слуцкія паясы на выстаўцы выяўленчага мастацтва Беларускай ССР 1940 г. ў Маскве.
6. Праблемы вывучэння слуцкіх паясоў і фарміраванне грамадскіх стэрэатыпаў іх успрымання.

Літаратура:

Беларускі народны арнамент : альбом / Савет прам. кааперацыі БССР ; склад. : К.І. Паўлава [і інш.] ; адк. рэд. В. Ф. Мацюшка. – Мінск : Савет прам. кааперацыі БССР, 1953. – [б/с].

Кацер, М.С. Народно-прикладное искусство Белоруссии от первобытного общества до 1917 года / М.С. Кацер. – Минск : Вышэйшая школа, 1972. – 173 с.

Каталёг выстаўкі слуцкіх паясоў / Беларускі дзяржаўны музей. – Менск : Друкарня Інстытуту Беларускае культуры, 1927. – 20 с.

Ластоўскі, В. Выбраныя творы / В. Ластоўскі / уклад., прадмова і каментары Я. Янушкевіч. – Менск : МФ «Беларускі кнігазбор», 1997. –  500 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ластоўскі В. Мае ўспаміны аб М. Багдановічы / В. Ластоўскі // Крывіч. – 1926. – № 1 (11). – Каўнас, 1926. – С. 62–66.

Ластоўскі, В. Кароткая энцыклапедыя старасьвеччыны / В. Ластоўскі : Уклад. Я. Янушкевіча. – Мінск : Хурсік, 2003. – 228 с.

Палеес, С.Д. Слуцкие пояса / С.Д. Палеес // Изобразительное искусство Белорусской ССР : каталог выставки / сост. Е.В. Аладова, С.Д. Палеес. – М.–Л. : Искусство, 1940. – С. 12–14.

Якунина, Л.И. Пояса слуцкие в собрании Государственного исторического музея / Л.И. Якунина. – Москва : Наркомпрос РСФСР, 1941. – 16 с.

Якуніна, Л.І. Слуцкія паясы / Л. І. Якуніна. – Мінск : Выдавецтва Акадэміі Навук Беларусі, 1960. – 240 с.

1. **Паэтычны вобраз слуцкіх паясоў у вершы М. Багдановіча «Слуцкія ткачыхі» (1912).**

У XX ст. слуцкаму поясу з прадмета раскошы і мастацтва было наканавана ператварыцца ў беларускі нацыянальны сімвал. Слуцкі пояс-міф, сімвалічны вобраз, неадрыўны ад гісторыі станаўлення беларускай нацыі, адзін з найбольш яскравых культурных маркераў працэсу выспявання беларускай ідэнтычнасці. З пачатку XX ст. слуцкія паясы робяцца сімвалічнымі ўдзельнікамі беларускага нацыянальнага адраджэння.

Міфалагізацыі і сімвалізацыі слуцкіх паясоў у нацыянальнай самасвядомасці беларусаў моцна паспрыяў верш Максіма Багдановіча (1891–1917) «Слуцкія ткачыхі» (1912). Паэт быў у захапленні ад мастацтва слуцкіх паясоў і абвострана адчуваючы іх роднасць да гісторыі і культуры Беларусі, стварыў у сваім славутым вершы высокапаэтычны вобраз нацыянальнага сімвала. Вобраз прыгонных дзяўчат-ткачых назаўсёды злучаны паэтам з хараством славутых слуцкіх тканін. Важная роля паэтычнага твора М. Багдановіча “Слуцкія ткачыхі” заключана ў тым, што ў ім упершыню зазначаны яскравыя грані бясспрэчнага нацыянальнага сімвалу беларусаў. Гэты верш распачаў і важную нацыянальна-культурную працу па сімвалізацыі і міфалагізацыі слуцкага пояса, якая сфарміравала ў самасвядомасці некалькіх пакаленняў беларусаў трывалае ўяўленне аб злучнасці гэтай мастацкай каштоўнасці з гісторыяй і культурай Беларусі.

2. **Вывучэнне слуцкіх паясоў Вацлавам Ластоўскім і Міколай Шчакаціхіным у Інстытуце беларускай культуры (1922–1929).**

Беларускія адраджэнцы пачатку XX ст. успрымалі выразную, характэрную і непаўторную мастацкую стылістыку арнаментальных матываў слуцкіх паясоў як яскравую праяву беларускага стылю. Ля вытокаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канструявання нацыянальнага сімвала беларусаў – слуцкія паясы, стаяў беларускі гісторык, філолаг, літаратуразнавец, этнограф Вацлаў Ластоўскі (1883–1938). У сваіх публікацыях ён не аднойчы звяртаўся да тэмы слуцкіх паясоў. Праблема стварэння нацыянальнага стылю была ўпершыню ўзнята В. Ластоўскім у нашаніўскім артыкуле «Аб патрэбе стылю ў жыцці народа» (1909). В. Ластоўскі першы ў беларускай кніжнай графіцы выкарыстаў матывы арнаменту слуцкіх паясоў для афармлення літаратурна-публіцыстычнага зборніку “Маладая Беларусь”, які быў выдадзены ў 1912–1913 гг. ў Пецярбурзе. Аб экслібрысе В. Ластоўскага 1912 г. з выявай арнаменту слуцкіх паясоў.

Даследаванне слуцкіх паясоў, старажытнага дойлідства, іканапісу, графікі, народнага арнаменту становіцца прыярытэтным кірункам вывучэння беларускага мастацтва ў 1920-я гг. ў БССР. Гэтай праблематыкай займаліся секцыя беларускага мастацтва і камісія па гісторыі мастацтва пры Інстытуце беларускай культуры (Інбелкульт). Праблему паходжання і развіцця арнаменту, слуцкія паясы і іх арнаментыку даследаваў мастацтвазнавец, навуковы сакратар Інбелкульта па вывучэнні мастацтва, дацэнт кафедры гісторыі мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Мікола Шчахаціхін (1896–1940), з іменем якога звязана станаўленне беларускага мастацтвазнаўства.

Захапленне даследчыкаў і мастакоў народным арнаментам і слуцкімі паясамі было цесна звязана з вельмі актуальнай у БССР у 1920-я гг. праблемай асэнсавання нацыянальных асаблівасцей беларускага мастацтва і грамадскім запатрабаваннем на распрацоўку беларускага мастацкага стылю.

**2. Выстаўка слуцкіх паясоў у Беларускім дзяржаўным музеі (1927).**

Значнай вехай працэсу актуалізацыі слуцкіх паясоў як беларускай нацыянальнай каштоўнасці ў перыяд нацыянальна-культурнага адраджэння ў 1920-я гг. ў БССР з’явілася падрыхтоўка і экспанаванне выстаўкі слуцкіх паясоў у Беларускім дзяржаўным музеі у Мінску ў 1927 г. Яна стала вынікам плённага супрацоўніцтва Інбелкульта і Беларускага дзяржаўнага музея.

Каталог выстаўкі. Прадмова, дэкаратыўнае афармленне.

**3. Праблемы вывучэння слуцкіх паясоў і фарміраванне грамадскіх стэрэатыпаў іх успрымання.**

Тэма слуцкіх паясоў як нацыянальнага сімвала ў перадваеннай Беларусі трывала ўвайшла ў грамадскую свядомасць. Шаўковыя паясы, выраблены ў Слуцку атаясамліваліся з беларускай зямлёй, культурай беларусаў, ацэньваліся як каштоўнасць нацыянальнай спадчыны.

У 1940 г. на Выстаўцы выяўленчага мастацтва Беларускай ССР у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рамках дэкады беларускага мастацтва ў Маскве побач з творамі беларускіх мастакоў у тэхніцы жывапісу, скульптуры, графікі, фотаздымкамі новых архітэктурных аб'ектаў, экспанаваліся ўзоры старажытнабеларускага мастацтва і 32 слуцкіх пояса. Яны паступілі ў 1939 г. ў Дзяржаўную карцінную галерэю з Нясвіжскага замка, маёмасць якога была нацыяналізаваная савецкімі ўладамі пасля аб'яднання БССР і Заходняй Беларусі.

Замацаванню сувязі слуцкіх паясоў з беларускай народнай традыцыяй у грамадскай свядомасці паспрыяла выданне ў 1953 г. рэпрэзентатыўнага альбома "Беларускі народны арнамент". Нараду з узорамі народнага тканага і вышыванага арнаменту ў альбом уключаны асобны раздзел "Слуцкія паясы", у якім прадстаўлены восем слуцкіх паясоў і іх фрагментаў.

Значны ўнёсак у вывучэнне кунтушовых паясоў зроблены Лідзіяй Якунінай (1889–1967) – расійскай даследчыцай, супрацоўніцай адзела тканін Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве. Даследчыца падрыхтавала манаграфію «Слуцкія паясы» (1960), якая стала першым грунтоўным мастацтвазнаўчым даследаваннем кунтушовых паясоў у СССР. Кніга была выдадзена ў Мінску на беларускай і рускай мовах выдавецтвам Акадэміі навук БССР.

Публікацыя кнігі Л. Якунінай выклікала новую хвалю даследчыцкай цікавасці да слуцкіх паясоў, перш за ўсе, у асяроддзі беларускіх гісторыкаў.

Працэс вывучэння і папулярызацыі слуцкіх паясоў у нашай краіне быў значна актывізаваны ў выніку прыняцца Дзяржаўнай праграмы адраджэння тэхналогіі і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі «Слуцкія паясы» на 2012–2015 гг.

Тэма 5. **Гісторыя музеефікацыі і калекцыяніравання слуцкіх паясоў.**

Пытанні:

1. Слуцкія паясы як сямейныя рэліквіі.
2. Слуцкія паясы ў зборы Беларускага музея імя Івана Луцкевіча да 1945 года.
3. Слуцкія паясы ў даваенных фондах Беларускага дзяржаўнага музея ў Мінску.
4. Слуцкія поясы ў замежных музеях.

Літаратура:

В градзе Слуцке: фотаальбом / уклад. і аўт. прадм. М.М. Яніцкая. – Мінск : Асобны, 2006 – 136 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гужалоўскі, А.А. Як рабавалі беларускія музеі / А.А. Гужалоўскі // Спадчына.– 1992. – № 5.– С. 56–59.

Ельскі, А. Гістарычныя звесткі пра радзівілаўскую ткальню паясоў у Слуцку / А. Ельскі // Выбранае. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. – С. 65–86.

Лабачэўская, В.А. Зберагаючы самабытнасць : З гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі / В.А. Лабачэўская. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 375 с., іл.

Якуніна, Л.І. Слуцкія паясы / Л.І. Якуніна.– Мінск : Выд-ва Акадэміі навук БССР, 1960. – 240 с.

**1. Слуцкія паясы як сямейныя рэліквіі.**

З канца XVIII ст. слуцкія паясы паступова выходзяць з ужывання, страчваюць сваё практычнае прызначэнне, але іх слаўная гісторыя і дэкаратыўныя вартасці забяспечылі ім другое жыццё. Разам з іншай цэннай маёмасцю шаўковыя паясы перадаваліся ў спадчыну, зберагаліся ў сем’ях з пакалення ў пакаленне як памяць аб продках.

У касцёлах і цэрквах была распаўсюджана практыка, калі кунтушовыя паясы выкарыстоўваліся для вырабу святарскага адзення – у якасці частак арнатаў і другіх літургічных прадметаў (стулы, бурсы, накрыўкі на келіхі, поручы).

Пасля закрыцця мануфактуры ў Слуцку паясы становяцца прадметам калекцыяніравання ў якасці твораў дэкаратыўна-прыкладного мастацтва, сямейных рэліквій і сімвалаў былой велічы гісторыі і культуры краю. Збіралі паясы князі Радзівілы ў палацах Нясвіжа і Паланэчкі, Сапегі ў Ружанах, граф Канстанцін Тышкевіч у сваім музеі ў Лагойску (Барысаўскі павет), калекцыянер Антон Брадоўскі ў Вільні. Але самы каштоўны і колькасны збор слуцкіх паясоў знаходзіўся ў вядомага калекцыянера, нумізмата і бібліяфіла графа Эмерыка фон Гуттена Чапскага ў яго багатым музеі ў Станькаве пад Мінскам.

2. **Слуцкія паясы ў зборы Беларускага музея імя Івана Луцкевіча да 1945 года.**

Іван Луцкевіч (1881–1919) усё сваё жыццё збіраў творы беларускай мінуўшчыны і мастацтва дзеля стварэння першага беларускага нацыянальнага музея. За год да сваёй заўчаснай смерці ён падараваў сваю калекцыю Беларускаму навуковаму таварыству ў Вільні, якое пры намаганнях Антона Луцкевіча заснавала у 1921 г. Беларускі музей.

З інвентарнай кнігі музея, пачатай у 1922 г., вынікае, што на той час тут захоўваліся 3 слуцкіх пояса, 3 кунтушовых пояса іншых мануфактур, 7

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фрагментаў паясоў, 3 стулы са слуцкіх паясоў і арнат з “літага“ слуцкага пояса з ткацкай меткай “Леа Мажарскі”.

Пасля закрыцця музея уладамі Літвы яго фонды былі падзелены паміж рознымі музеямі, бібліятэкамі, архівамі Літвы і Беларусі. Каштоўныя слуцкія паясы з гэтага музейнага збору ў Беларусь не трапілі.

### 3. Слуцкія паясы ў даваенных фондах у Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР.

Каштоўнейшая калекцыя з 47 слуцкіх і кунтушовых паясоў вытворчасці іншых мануфактур, якая паходзіць с Радзівілаўскга збору ў Нясвіжскім замку, перададзеная ў 1939 г. Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР зніклі падчас Другой сусветнай вайны. Аставіны знікнення калекцыі ў чэрвені 1941 г.

Падставай для пошуку калекцыі паясоў з Нясвіжа з’явіліся архіўныя фотаздымкі, якія ў 2003 г. былі перададзены Нацыянальнаму мастацкаму музею Рэспублікі Беларусь у дар ад мастацтвазнаўцы В.А. Лабачэўскай. Гэта 23 фатаграфіі з адлюстраваннямі паясоў слуцкага тыпу канца XVIII – пачатку XIX ст., якія, мяркуючы па анатацыі на адваротным баку фота, былі зроблены падчас Дэкаднай выстаўцы беларускага выяўленчага мастацтва ў Маскве ў чэрвені 1940 г.

### 4. Слуцкія поясы ў айчынных і замежных музеях.

Шмат зрабілі беларускія музеі ў апошнія гады, каб прадставіць сваім гледачам сапраўдныя ўзоры слуцкіх паясоў і кунтушовых паясоў слуцкага тыпу, ўзорамі для якіх служылі шэдэўры шоўкаткацкага мастацтва, створаныя ў Слуцку. Пад канец 2013 г. Слуцкі краязнаўчы музей на дабрачынныя ахвяраванні арганізацый і жыхароў горад здолеў набыць слуцкі пояс часоў Яна Маджарскага: чатырохбаковы, з металізаванымі ніцямі ў добрым стане захаванасці. Мінскі абласны краязнаўчы музей набыў ў 2014 г. на спонсарскія сродкі пояс з прыватнага збору. Прадстаўлены узоры паясоў у новых музейных экспазіцыях. У Замкавым комплексе “Мір” дэманструецца фрагмент кунтушовага пояса з манаграмай “FS”, набыты ў прыватнай асобы. Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік “Нясвіж” мае два кунтушовых пояса мануфактуры Пасхаліса Якубовіча і фрагменты двух паясоў.

У наш час слуцкія паясы, кунтушовыя паясы вытворчасці іншых мануфактур і іх фрагменты выкананыя ў другой палове XVIII – пачатку XIX ст. ёсць у зборах дзесяці музеяў Беларусі. Гэта Віцебскі абласны краязнаўчы музей (19 фрагментаў), Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(1 пояс), Літаратурны музей Максіма Багдановіча (1 цэлы слуцкі пояс і 2 фрагмента), Мінскі абласны краязнаўчы музей ў Маладзечна (2 слуцкіх пояса і 1 фрагмент), Музей старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1 слуцкі пояс і 1 пояс слуцкага тыпу), Нацыянальны мастацкі музеі Рэспублікі Беларусь (2 фрагмента слуцкіх паясоў). Найбольш прадстаўнічую калекцыю мае Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, якая складаецца з 5 кунтушовых паясоў: 2 слуцкіх і яшчэ 3 цэлых пояса, якія былы выраблены на мануфактурах у Кабылцы (Польшча), у Ліёне (Францыя) і пояса невядомай вытворчасці, а таксама слуцкага амафора-пояса і 8 фрагментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. СЛУЦКІ ПОЯС У СУЧАСНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ

Тема 6. **Слуцкі пояс у беларускім выяўленчым, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве і сцэнаграфіі**

Пытанні:

1. Выкарыстанне арнаментальных матываў слуцкага пояса ў выяўленчым і народным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Беларусі ў 1950–1960-я гг.
2. Матывы слуцкіх паясоў у творчасці М.П. Міхалапа (1886–1979).
3. Вобраз кунтушовага строю і слуцкага пояса ў мастацтве сцэнаграфіі і сцэнічным і гістарычным касцюме.
4. Мастацкае афармленне Палаца Незалежнасці.

Літаратура:

Гайдукова, Ю.А. Касцюмы «Песняроў» як адлюстраванне нацыянальнага вобраза беларуса / Ю.А. Гайдукова // Роднае слова. – 2009. – № 11. – С. 83 – 85.

Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. / редкал.: У.І. Няфёд [і інш.]; Акадэмія навук Беларускай ССР, Ін-т мастацтвазн., этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка. – 1983–1987.

Народнае і прыкладное мастацтва Савецкай Беларусі = Народное и прикладное искусство советской Беларуси / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акад. нпвук БССР. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1958. – 230 с.

Сучасныя тэатральнае і экранныя мастацтвы : традыцыі і наватарства /

В.М. Ярмалінская [і інш.] ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 451 с.

**1. Выкарыстанне арнаментальных матываў слуцкага пояса ў выяўленчым і народным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Беларусі ў 1950–1960-я гг.**

За слуцкім поясам трывала замацавалася роля выразнага беларускага нацыянальнага сімвала. Вобраз ткачых, створаны М. Багдановічам, трактаваўся савецкай навукай і сродкамі масавай інфармацыі як яскравая ілюстрацыя феадальнага прыгнёту беларускага народу ў мінулым. Бачнае ўвасабленне набыў гэты вобраз у манументальным жывапісным палатне «Слуцкія ткачыхі», створаным у 1959 г. мастаком М. Блішчам (1917–1966).

Слуцкія матывы экспанатаў экспазіцыі дэкаднай выстаўцы ў Маскве ў 1955 г.

**2. Матывы слуцкіх паясоў у творчасці М.П. Міхалапа (1886–1979).**

Слуцкія матывы для аздаблення дэкаратыўна-прыкладных твораў з фарфору і керамікі, для архітэктурнага дэкору і малых архітэктурных форм актыўна выкарыстоўваў у 1950-я гг. беларускі мастак Мікалай Пракоп'евіч. Міхалап. Аўтар малых архітэкутурных форм і асвятляльных ліхтароў з выявай знакамітага слуцкага арнаменту, якія і зараз упрыгожваюць пр. Незалежнасці ў г. Мінске.

**3. Вобраз кунтушовага строю і слуцкага пояса ў мастацтве сцэнаграфіі і сцэнічным і гістарычным касцюме.**

Кунтушовыя строі і слуцкі пояс справядліва займаюць сваё адметнае месца ў сцэнічнай прасторы беларускіх тэатраў як мастацкі знак-сімвал, вобраз багатай гісторыі і культуры шляхецкай Беларусі.

Матывы нацыянальнай мастацкай спадчыны ў сцэнаграфічнай творчасць П.В. Масленікава (1914–1995). Мастак упершыню ў беларускім тэатральна-дэкарацыйным мастацтве звярнуўся да матываў слуцкіх паясоў. узнавіў атмасферу старабеларускага шляхецкага побыту, праўдзіва перадаў кунтушовыя ўборы з паясамі.

Кунтушовыя строі і слуцкія паясы ў сучасных пастаноўках тэатра і ў кіно.

Творчасць мастакоў сцэнічных касцюмаў Ю.А. Піскуна, В.В. Дзёмкінай, В.П. Маркавец-Бартлавай. Куштушовы касцюм і слуцкія паясы ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1970-х гадах ўпершыню былі выкарыстаны ў сцэнічных касцюма ўдзельнікаў славутага вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры». Касцюмы для Беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі».

Рэканструкцыі гістарычных касцюмаў: Ю.А. Піскуном для экспазіцый музея Замкавы комплекс «Мір», Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж», Г.А. Барвенавай для Музея гісторыі Магілёва, Л.У. Дамненковай для Ратушы ў Нясвіжы і Музея гісторыі слуцкіх паясоў у Слуцку.

**4. Мастацкае афармленне Палаца Незалежнасці.**

З новай моцай тэма слуцкага пояса загучала ў архітэктурным і дэкаратыўна-мастацкім афармленні афіцыйнай рэзідэнцыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – Палацы Незалежнасці, які быў пабудаваны ў 2011–2013 гг. па праекту беларускага архітэктара Ул. Архангельскага. Будынак прызначаны для правядзення дзяржаўных афіцыйных мерапрыемстваў і цырымоній, міжнародных сустрэч вышэйшага ўзроўню. Афармленне будынку падкрэслівае непахіснасць беларускай дзяржаўнасці і незалежнасці.

Працы для афармлення Палаца Незалежнасці на конкурснай аснове былі створаны членамі грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз мастакоў" і выкананы на базах Камбіната дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ім. А. М. Кішчанкі, Мастацкага камбіната, Скульптурнага камбіната.

Тэма 7. **Адраджэнне вытворчасці слуцкіх паясоў на сучасным этапе**

Пытанні:
1. Дзяржаўная праграма адраджэння тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі «Слуцкія паясы» на 2012–2015 гады.
2. Адраджэнне вытворчасці слуцкіх паясоў на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Слуцкія паясы» ў Слуцку.
3. Сімвал нацыянальнага гонару і годнасці – слуцкі пояс.

Літаратура:

Аб зацвярджэнні Дзяржаўнай праграмы адраджэння тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі ”Слуцкія паясы“ на 2012 – 2015 гады [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.government.by/ru/solutions/1904. – Дата доступу : 20.06.2015.

Лабачэўская, В.А. Слуцкі пояс : культуралагічны зрэз міфа /



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В.А. Лабачэўская // Гісторыя, культуралогія, мастацтвазнаўства : матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый», Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г. / редкал.: В. Скалабан (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001. – (Беларусіка = Albaruthenika ; кн. 21). – С. 205–213.

Лазука, Б.А. Адраджэнне традыцый беларускага мастацкага ткацтва : нацыянальная ідэя і шляхі яе рэалізацыі / Б.А. Лазука // Беларускія паясы: гістарычныя шляхі развіцця і сучасная практыка : матэр. рэспубл. навук.-практ. канф., Слуцк, 21 верас. 2013 / уклад. Б.А. Лазука. – Мінск : Зміцер Колас, 2013. – С. 37– 44.

**1. Дзяржаўная праграма адраджэння тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі «Слуцкія паясы» на 2012–2015 гады.**

Умацаванне суверэннасці і дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь запатрабавала актуалізацыі сімвалаў беларусаў, у якіх найбольш поўна і выразна ўвасоблена нацыянальная ідэя, якія атаясамліваюцца з багатай культурнай спадчынай нашага народа.

Значным крокам на гэтым шляху стала распрацоўка і прыняцце Дзяржаўнай праграмы адраджэння тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі «Слуцкія паясы» на 2012–2015 гады, якая была зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22.11.2012 № 1069. У праграме прадугледжана комплексная сістэма мер па рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у сферы захавання традыцый і развіцця нацыянальнага мастацтва, народных мастацкіх промыслаў (рамёстваў). Упершыню ў гісторыі на дзяржаўным ўзроўні з забеспячэннем пэўнага ўзроўню фінансавання распачата мэтанакіраванае вяртанне ў сучасную сацыяльна-культурную прастору слуцкіх паясоў, іх прапаганда як культурнага і ідэалагічнага складальніка нацыянальнай ідэі.

**2. Адраджэнне вытворчасці слуцкіх паясоў на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Слуцкія паясы» ў Слуцку.**

Важным напрамкам ажыццяўлення дзяржаўнай праграмы з’яўляецца адраджэнне вытворчасці слуцкіх паясоў, выкананне іх аналагаў, копій, выкарыстанне мастацкіх стылізацый у сувенірнай прадукцыі, што павінна адыгрываць значную ролю ў сучасным эканамічным і культурным жыцці Беларусі, быць задзейнічаным у прадстаўніцкіх мэтах, музейнай і сцэнічнай практыцы. Дзеля гэтага з праграму закладзена даследаванне характару і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэхніка-тэхналагічных асаблівасцей вытворчасці аўтэнтычных слуцкіх паясоў на слуцкай мануфактуры; вывучэнне матэрыялаў, якія выкарыстоўваліся ў стварэнні паясоў, і распрацоўка прапаноў па іх замене ў сучасных умовах прамысловай вытворчасці пры захаванні асноўных вобразных, кампазіцыйных, пластычных асаблівасцей першаўзораў.

У адпаведнасці з праграмай была праведзена рэканструкцыя вытворчага корпуса рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства «Слуцкія паясы» ў Слуцку. Менавіта на гэта прадпрыемства была ўскладзена адказная задача – стаць пераемнікам славутых традыцый мастацтва слуцкіх паясоў. Музей гісторыі слуцкіх паясоў. Скульптуры «Ткач» і «Адраджэнне слуцкага пояса», скульптар Сяргей Гумілеўскі і арх. Ірына Варанец.

Значным вынікам рэалізацыі дзяржаўнай праграмы стала наладжванне вытворчасці па вырабу сучасных аналагаў і копій слуцкіх паясоў, распрацоўка сувенірных вырабаў на падставе стылізацыі іх кампазіцый і арнаментыкі. Для беларускай культуры такі падыход дазволіў фактычна, на практыцы сцвердзіць слуцкі пояс у якасці нашага нацыянальнага брэнду. Гэта стала магчымым дзякуючы вялікай комплекснай працы гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў, дызайнераў, ткачоў-практыкаў сумесна з прадпрыемствамі “Слуцкія паясы” у Слуцку па вывучэнні страчаных тэхналогій вырабу слуцкага пояса і іх узнаўленні ў сучасных умовах.

## 3. Сімвал нацыянальнага гонару і годнасці – слуцкі пояс.

Мерапрыемствы па рэалізацыі праграмы мэтанакіравана сцвердзілі слуцкія паясы як сімвал нацыянальнага гонару і годнасці.

У 2011 г. ў музеі быў прэзентаваны гісторыка-культурны праект «Слуцкія паясы – нацыянальная спадчына і гонар Беларусі» да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча, у рамках якога адбылася прэзентацыя настольнага календара на 2012 г. «Слуцкія паясы» (РУП «Мінская друкарская фабрыка» Дзяржзнака) і прэзентацыя хранікальна-дакументальнага фільма «Слуцкія паясы – знакі лёсу». Акцыя стала спосабам папулярызацыі ўнікальнай спадчыны нацыянальнага мастацтва ў сучасным грамадстве, пазнаёміла з падрабязнасці гісторыі слуцкіх паясоў.

У 2013 г. Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь выпусціў у абарот камплект з пяці памятных манет серыі “Слуцкія паясы”. У 2014 г. Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь у абарачэнне ўведзены паштовая маркі і канверт Першага дня “Слуцкія паясы”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З кароткі перыяд 2012–2015 гг. у нашым грамадстве актуалізавана тэма адраджэння традыцый слуцкіх паясоў, прадпрынятыя канкрэтныя захады па іх вяртанню ў сферу нацыянальнай культуры ў выглядзе рарытэтных аўтэнтыкаў, якія набыты для музеяў краіны, і сучаснай вытворчасці іх копій і аналагаў на падставе распрацоўкі ўнікальнай кап'ютэрызаванай тэхналогіі ткацтва і наладжвання вытворчасці. Беларусы здолелі прадэманстраваць міжнароднай супольнасці высакароднае стаўленне да сваіх нацыянальных каштоўнасцей, волю да іх вяртання, пошук новых творчых падыходаў да ажыццяўлення такой годнай задачы. Ужо сёння без перабольшання можна сцвярджаць, што ў нашай краіне назапашаны ўнікальны вопыт духоўнага выхавання нацыі на лепшых узорах нацыянальнай спадчыны. Слуцкі пояс – культурны міф, які выбудоўвася дзеячамі беларускага адраджэння ў XX ст. праз увасабленне ў творах літаратуры, мастацтва, архітэктуры, у нашы дні набыў рэальнае жыццё у сапраўдных шэдэўрах слуцкага ткацтва ў музеях, у сферы вытворчасці падарункавых вырабаў-копій і сувеніраў. Сучаснае выкарыстанне мастацкага вобраза слуцкага пояса, яго адметнай па стылю арнаментацыі мае надзвычай шырокую сферу выкарыстання і сучаснае жыццё падказвае самыя разнастайныя варыянты і спосабы іх прымянення. Веды аб гісторыі слуцкіх паясоў, трывалае ўяўленне аб іх хараcтве сталі неад'емнай часткай духоўнага жыцця нашага грамадства, яны актыўна фарміруюць каштоўнасныя арыенціры і нацыянальную ідэнтычнасць новых пакаленняў маладых беларусаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Вучэбныя выданні, рэкамендаваныя МА РБ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ВМК

## 4.1 Пералік пытанняў да семінарскіх і практычных заняткаў

Семінар 1

**Гісторыя ткацкай мануфактуры ў Слуцку**

1. Асноўныя прычыны выкарыстання кунтушовага пояса ў складзе мужчынскага арыстакратычнага касцюма Рэчы Паспалітай.
2. Імпарт усходніх паясоў у Рэч Паспалітую ў XVIII стагоддзі.
3. Асноўныя прычыны аб'яднання нясвіжскай і слуцкай персіярань у адзінае прадпрыемства.
4. Жыццё і дзейнасць Яна і Лявона Маджарскіх.
5. Сацыяльнае становішча працаўнікоў слуцкай мануфактуры.
6. Асноўныя этапы дзейнасці і галоўныя прычыны заняпаду слуцкай мануфактуры кантушовых паясоў.
7. Сігнатуры слуцкіх паясоў

*Літаратура*

Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. / рэдкал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987–1994. – Т. 2: Другая палова XVI – канец XVIII ст. / Я.М. Сахута. – 1988. – 384 с.

Ельскі, А. Гістарычныя звесткі пра радзівілаўскую ткальню паясоў у Слуцку / А. Ельскі // Выбранае. – Мінск: «Беларускі кнігазбор», 2004. – С. 65-86.

Кацер, М. С. Народно-прикладное искусство Белоруссии от первобытного общества до 1917 года / М. С. Кацер. – Минск : Вышэйшая школа, 1972. – 173 с.

Лазука, Б.А. Слуцкія паясы: адраджэнне традыцый / Б.А. Лазука. – Мінск: Беларусь, 2013. – 127 с.: іл.

Лазука, Б.А. Слуцкія паясы і еўрапейскі тэкстыль XVIII стагоддзя. Малы лексікон / Б.А. Лазука. – Мінск: Беларусь, 2015. – 170 с.: іл.

Якуніна, Л.І. Слуцкія паясы / Л.І. Якуніна. – Мінск: Выдавецтва Акадэміі Навук Беларусі, 1960. – 238 с.

Семінар 2

**Мастацка-кампазіцыйныя асаблівасці і арнамент слуцкіх паясоў**

1. Кампазіцыя слуцкага пояса.
2. Асноўныя стылістычныя асаблівасці слуцкіх паясоў, выраблены у 1770-х – 1790-х гг.
3. Тыпалогія паясоў слуцкай мануфактуры паводле дэкаратыўных раслінна-кветкавых матываў, змешчаных у кампазіцыі «галоў».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Асноўныя варыянты арнаментацыі сярэдніка і шлячкоў-бардзюраў слуцкіх паясоў.

5. Тэхніка і матэрыялы для вырабу слуцкія паясы?

6. Тэхналагічныя асаблівасці вырабу слуцкіх паясоў паводле іх выгляду: «аднабаковы аднаіцавы пояс», «аднабаковы двухліцавы пояс», «двухбаковы двухліцавы пояс», «двухбаковы трохліцавы пояс», «двухбаковы чатырохліцавы пояс».

*Літаратура*


Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. / рэдкал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987–1994. – Т. 2: Другая палова XVI – канец XVIII ст. / Я.М. Сахута. – 1988. – 384 с.

Кацер, М. С. Народно-прикладное искусство Белоруссии от первобытного общества до 1917 года / М. С. Кацер. – Минск : Вышэйшая школа, 1972. – 173 с.

Лазука, Б.А. Слуцкія паясы: адраджэнне традыцый / Б.А. Лазука. – Мінск: Беларусь, 2013. – 127 с.: іл.

Лазука, Б.А. Слуцкія паясы і еўрапейскі тэкстыль XVIII стагоддзя. Малы лексікон / Б.А. Лазука. – Мінск: Беларусь, 2015. – 170 с.: іл.

Слуцкія паясы. Альбом-каталог выставы 29 верасня 2005 г. – 31 студзеня 2006 г. / уклад. І. Зварыка. – Мінск : «Юніпак», 2008. – 71 с.

Слуцкія паясы і літургічнае адзенне са збораў Нацыянальнага музея ў Варшаве і Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Каталог выстаўкі 5 лістапада 2014 – 6 красавіка 2015 г. / аўт. тэкстаў, складальнікі Э. Арліньска-Мяноўска [і інш.]. – Мінск : Першая ўзорная друкарня, 2014. – 82 с.

Якуніна, Л.І. Слуцкія паясы / Л.І. Якуніна. – Мінск: Выдавецтва Акадэміі Навук Беларусі, 1960. – 238 с.


Семінар 3

**Кунтушовы пояс у строі беларускай шляхты XVIII – XIX стст.**

1. Прычыны з'яўлення кунтушовага строю ў адзенні беларускай шляхты.

2. Асноўныя кампаненты мужчынскага шляхецкага строю XVII–XIX стст., іх паходжанне, канструктыўныя асаблівасці, колерая гама.

4. Сімвалічная роля шаўковага кунтушовага пояса ў беларускім мужчынскім шляхецкім строі.

5. Асноўныя варыянты апяразвання кунтушовым поясам.

*Літаратура*


Адзенне // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 1 : А – Беліца / Беларус. энцыкл. ; рэдкал. : М.В. Біч [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 48–


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

52.

Барвенава, Г.А. «Грайкія струны» слуцкіх паясоў. Рэфлексія мадэлі сусвету ў паласатых тканінах / Г.А. Барвенава // Роднае слова. – 2014.– № 11. – С. 68–71.

Бохан, Ю.М. Побыт феадалаў Вялікага княства Літоўскага ў XV – сярэдзіне XVII стагоддзя / Ю.М. Бохан, А.А. Скеп'ян. – Мінск : Беларусь, 2011. – 271 с.

Бялявіна, В.М. Мужчынскі касцюм на Беларусі / В.М. Бялявіна, Л.В. Ракава. – Мінск : Беларусь, 2007. – 303 с.

В граде Слуцке: фотаальбом / уклад. і аўтар прадмовы М.М. Яніцкая. — Мінск : Асобны, 2006. – 136 с.

Клімуць, Л.Я. Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI - XVIII стагоддзях / Л. Я. Клімуць. – Мінск : Беларусь, 2013. – 127 с.

Мальдзіс, А.І. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі / А.І. Мальдзіс. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2009. – С. 3–268.

Мерцалова, М.Н. Костюм разных времен и народов / М.Н. Мерцалова. – В 4-х т. – Т. 2. – Москва : Академия моды, 1996. – 430 с.

Молчанова, Л.А. Очерки материальной культуры белоруссов XVI – XVIII вв. / Л.А. Молчанова. – Мінск : Беларусь, 1981. – 212 с.

